Источник: "Краязнаўчая газета" — 2014–02–27

# На тым тыдні...

✓**19 лютага** ў мінскай кнігарні «ЛогвінаЎ» прайшла **прэзентацыя беларускага перакладу п'есы Оскара Уайлда «Саламея»**, у якой для стварэння адпаведнага кантэксту ўзялі ўдзел перакладчыца п'есы на беларускую мову Кацярына Маціеўская, а таксама перакладчыкі Андрэй Хадановіч, Юлія Цімафеева і Ганна Янкута.

✓**20 лютага** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылося **ўрачыстае адкрыццё трэцяй чаргі новай экспазіцыі «Шляхі»**. Яе стваральнікі імкнуліся праз творчасць Песняра паказаць народ, чалавека, асобу ў драматычных варунках 1930–1940-х гг. і ў час Вялікай Айчыннай вайны. Гэта асабліва актуальна ў год, калі наша краіна адзначае 70-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Экспазіцыйная прастора насычаная аўтэнтычнымі экспанатамі, фрагментамі інтэр'ера гасцініцы «Масква» – сведкамі апошніх дзён жыцця паэта. Асобнай старонкай экспазіцыі стала ўшанаванне памяці Янкі Купалы ў нашай краіне і за мяжой.

Суіснаванне сапраўдных прадметаў мінулага, мемарыяльных рэчаў і сучасных мультымедыйных тэхналогіяў – адметнасць новай экспазіцыі аднаго са старэйшых музеяў краіны, які сёлета адзначае 70-гадовы юбілей з дня заснавання.

✓**21 лютага** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылася **вечарына «Мова продкаў маіх і нашчадкаў маіх – беларуская родная мова!»**, прымеркаваная да Міжнароднага дня роднай мовы. Арганізатарамі выступілі ЦНБ НАН Беларусі і Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры.

У праграме былі сустрэча са старшынёй Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Алегам Трусавым і адкрыццё кніжнай выстаўкі **«Ці знаў хто, братцы, з вас Тараса?»**. Выстаўка прысвечаная 125-годдзю першай публікацыі знакамітай паэмы «Тарас на Парнасе», якая яшчэ нядаўна лічылася ананімнай. Тут прадстаўленыя публікацыі паэмы, што захоўваюцца ў фондах бібліятэкі: некаторыя кніжныя выданні 1909 г., 1920 г. і сучасныя перавыданні. Асобны раздзел прысвечаны тэме аўтарства паэмы і гісторыі расскрыцця таямніцы.

А напрыканцы вечарыны выступілі дзіцячыя вакальныя калектывы мінскага Палаца дзяцей і моладзі.

✓**21 лютага** на мінскай сядзібе Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны адбылася **7-я агульнаадукацыйная дыктоўка** з нагоды Міжнароднага дня роднай мовы.

✓**21 лютага** Літаратурны музей Максіма Багдановіча запрасіў усіх ахвочых на **сустрэчу «Падвойныя зоркі беларускага Адраджэння»**, прымеркаваную да 100-годдзя выхаду рэцэнзіі «Песня чыстай красы» Антона Луцкевіча на зборнік «Вянок» Максіма Багдановіча. Прысутныя змаглі паглыбіцца ў асаблівасці дзейнасці А. Луцкевіча, даведацца пра яго ўнёсак у багдановічазнаўства. У імпрэзе ўзялі ўдзел прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі краіны, а асаблівым сюрпрызам стаў выступ унучатай пляменніцы А. Луцкевіча Маргарыты Пяровай, якая, жывучы ў Санкт-Пецярбургу, далучылася да мерапрыемства з дапамогай сучасных сродкаў камунікацыяў.

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні